Дадатак 1
да загада галоўнага ўпраўлення
ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Гомельскага аблвыканкама
ад _________ 2019 № ________

**Палажэнне**
аб правядзенні абласнога конкурсу прыгажосці
«Маленькая Прыгажуня - 2019»

**Агульныя палажэнні.**

Умовы правядзення абласнога конкурсу прыгажосці «Маленькая Прыгажуня – 2019» (далей – конкурс) вызначаюць парадак арганізацыі, правядзення і падвядзення вынікаў мерапрыемства.

**Мэты.**

Асноўнымі мэтамі конкурсу з'яўляюцца:

- эстэтычнае, духоўнае і патрыятычнае выхаванне маладога пакалення;
- фарміраванне грамадзянскай пазіцыі і любові да малой радзімы;
- папулярызацыя дзіцячай творчасці;
- развіццё і ўдасканаленне формаў сямейнага вольнага часу.

**Арганізацыйны камітэт.**

Арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама і дзяржаўная ўстанова «Цэнтр моды і прыгажосці «Крыштальная Німфа» (далей – Цэнтр моды).

Кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу ажыццяўляецца арганізацыйным камітэтам (далей – аргкамітэт), які ўзаемадзейнічае з зацікаўленымі суб'ектамі ў галіне культуры, іншымі арганізацыямі і ўстановамі па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення конкурсу, яго асвятлення ў сродках масавай інфармацыі.

Арганізацыйны камітэт зацвярджае склад журы, каштарыс расходаў, вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення конкурсу.

**Умовы ўдзелу ў конкурсе.**

У конкурсе могуць прымаць удзел дзяўчынкі ва ўзросце ад 8 да 10 гадоў з наяўнасцю творчых здольнасцяў і знешнімі дадзенымі, маючыя грамадзянства Рэспублікі Беларусь і пастаянна пражываючыя на тэрыторыі Гомельскай вобласці.

**Парадак правядзення конкурсу.**

Конкурс праводзіцца ў тры этапы.

Першы (адборачны) этап праходзіць 21 верасня 2019 года на базе ДУ «Цэнтр моды і прыгажосці «Крыштальная Німфа» (г. Гомель, праспект Рэчыцкі 24/3, будынак ПК «Фестывальны»).

У ходзе адборачнага этапу ўдзельнікі конкурсу прыбываюць у Цэнтр моды з законнымі прадстаўнікамі і запаўняюць анкету для ўдзелу ў конкурсе, выконваюць перад адборачнай камісіяй з ліку спецыялістаў Цэнтра моды фрагмент творчага нумара.

Па выніках адборачнага этапу вызначаюцца фіналісткі конкурсу ў колькасці 12 чалавек.

Другі (падрыхтоўчы) этап уключае фотасесію, а таксама рэпетыцыі фіналу конкурсу. Пражыванне і харчаванне ўдзельнікаў падчас падрыхтоўчага этапу ажыццяўляецца за кошт законных прадстаўнікоў.

Фота-, відэаматэрыял, зроблены падчас падрыхтоўкі да фіналу конкурсу, а таксама падчас правядзення фіналу, знаходзіцца ў распараджэнні арганізатараў мерапрыемства.

Трэці (фінальны) этап праводзіцца на сцэнічнай пляцоўцы горада Жлобін 26 кастрычніка 2019 года.

Праграма фіналу ўключае ў сябе 4 конкурсных выхады:

1.Візітоўка (дэфіле).

2.Верш пра малую радзіму.

3.Творчы выхад.

4. Фінальны выхад.

Конкурсныя выхады даюць удзельніцам магчымасць прадэманстраваць уменне трымацца на сцэне, фотагенічнасць, мастацтва дэфіле, акцёрскае майстэрства.

Адзенне для ўсіх выхадаў, акрамя творчага, а таксама паслугі цырульні і паслугі па візажу ажыццяўляюцца спецыялістамі Цэнтра моды.

Падчас правядзення генеральнай репетыцыі фіналу пітанне ўдзельніц конкурсу ажыццяўляецца за кошт законных прадстаўнікоў; пражыванне – за кошт арганізатараў.

**Парадак ажыццяўлення фінансавання.**

Фінансаванне арганізацыі і правядзення ўсіх мерапрыемстваў конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных дзяржаўнай установе «Цэнтр моды і прыгажосці «Крыштальная Німфа» на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016-2020гг., а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Дадаткова прыцягнутыя сродкі паступаюць на разліковыя пазабюджэтныя і дабрачынныя рахункі Цэнтра моды.

Даходы, атрыманыя ад правядзення конкурсу і ўсіх мерапрыемстваў, якія праходзяць у яго рамках, пасля выплаты ва ўстаноўленым парадку падаткаў, накіроўваюцца на памяншэнне расходаў па агульным каштарысе расходаў на правядзенне мерапрыемства.

**Работа журы фіналу конкурсу.**

Вынікі конкурсу падводзіць журы, якое ўзначальвае старшыня. У выпадку ўзнікнення спрэчных пытанняў старшыня журы валодае правам вырашальнага голасу.

Склад журы конкурсу зацвярджаецца аргкамітэтам не пазней за 10 дзён да фіналу.

Журы (у колькасці ад 5 да 11 чалавек) складаецца з ліку незалежных спецыялістаў у галіне моды, прыгажосці і стылю, а таксама сферы мастацтва.

Журы ацэньвае удзельніц па 10-бальнай шкале.

Рашэнне журы абвяшчаецца ў дзень фіналу конкурсу, абскарджанню і перагляду не падлягае.

**Падвядзенне вынікаў фіналу.**

Журы вызначае пераможцаў у наступных намінацыях:
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня – 2019»;
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня глядацкіх сімпатый – 2019» (вызначаецца з дапамогай інтэрнет галасавання на сайце crystalnymph.by);
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня «Усмешка» – 2019»;
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня «Загадка» – 2019»;
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня «Грацыя» – 2019»;
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня «Артыстычнасць» – 2019»;
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня «Дружалюбнасць» – 2019»;
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня «Талент» – 2019»;
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня «Фотагенічнасць» – 2019».
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня «Чароўнасць» – 2019»;
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня «Пяшчота» – 2019»;
- уладальніца тытула «Маленькая Прыгажуня «Мадэль» – 2019».

**Узнагароджанне пераможцаў фіналу конкурсу.**

Пераможца ў намінацыі: «Маленькая Прыгажуня – 2019», узнагароджваецца дыпломам, дыядэмай, стужкай і каштоўным падарункам на суму да 12 базавых велічынь.

Астатнія ўдзельніцы ўзнагароджваюцца дыпломамі згодна намінацый, маленькімі дыядэмамі, стужкамі і падарункамі ад партнёраў конкурсу.

Арганізатары маюць права ўнясення карэкціровак у сцэнарна-рэжысёрскі, арганізацыйны і часовы план, калі гэта не пацягне за сабой

істотных змяненняў і нязручнасцяў для ўдзельнікаў конкурсу і зацікаўленых асоб.

# АНКЕТА
## для ўдзелу ў конкурсе
## *«Маленькая Прыгажуня – 2019»*

1. Прозвішча ____________________
2. Імя ____________________
3. Імя па бацьку ____________________
4. Дата, месяц, год нараджэння (поўных гадоў) ____________________
5. Рост ____________________
6. Аб'ём грудзей ____________________
7. Аб'ём таліі ____________________
8. Аб'ём сцёгнаў ____________________
9. Колер валасоў ____________________
10. Колер вачэй ____________________
11. Памер абутку ____________________
12. Памер адзення ____________________
13. Месца вучобы ____________________
    ____________________
14. Кароткі расказ аб удзельніцы
    ____________________
    ____________________
    ____________________
    ____________________
    ____________________
    ____________________
15. Адрас прапіскі/пражывання ____________________
    ____________________
16. Прозвішча, імя законных прадстаўнікоў з кантактнымі тэлефонамі з указаннем аператара ____________________
    ____________________
    ____________________

____________________ Дата запаўнення

____________________ Подпіс / расшыфроўка